УДК 947.6 (=411.6) «1914/1916»

# ДЗЕЙНАСЦЬ АРГАНІЗАЦЫЙ ВПК І ЗЕМГОРА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ВА ЎМОВАХ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Міхаіл Цуба***
*Пінск, Беларусь*

У артыкуле разгледжана дзейнасць грамадскіх арганізацый, якія аказвалі разнастайную дапамогу арміі, а таксама асобам, якія цярпелі ад голаду і хваробаў падчас Першай сусветнай вайны

***Ключавыя словы: Беларусь, Першая сусветная вайна, дабрачынная дзейнасць, Беларусь, Земгора, ВПК***

Першая сусветная вайна карэнным чынам змяніла грамадскае жыццё на Беларусі. Гарады і мястэчкі былі перапоўнены ваеннымі штабамі, шпіталямі, майстэрнямі, складамі. Мабілізаваныя салдаты з усёй Расійскай імперыі складалі большую частку дарослага мужчынскага насельніцтва на беларускіх землях. Яны цяпер, галоўным чынам, уплывалі на лёс нашай Бацькаўшчыны. З гэтага часу, фактычна ўсе справы перайшлі ў рукі ваенных і ўчастковых земскіх начальнікаў. Галоўнай мэтай якіх было стварэнне "блізкай да народа, цвёрдай урадавай улады, якая ўнесла бы парадак і заканамернасць у лад усяго сельскага грамадскага жыцця, няўхільна ахоўвала мясцовы земскі мір і садзейнічала павышэнню маральнага і гаспадарчага ўзроўня сельскага насельніцтва" [1, с.2] Аказаўшыся ва ўмовах прыфрантавой паласы з усімі выцякаючымі адсюль абставінамі беларускі народ трапіў ў адчайнае становішча. Часткова падтрымаўшы царскі ўрад напачатку вайны, ён вымушаны быў затым весці пастаянную барацьбу за сваю годнасць, супраць гвалту і здзекаў, проста за выжыванне, як на адным так і на другім баку лініі фронта. Такім чынам, перыяд Першай сусветнай вайны з'явіўся часам цяжкіх выпрабаванняў для народаў, насяляючых Беларусь. Масавых палітычных, ды і эканамічных выступленняў у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі тут не адбылося. Гэта можна растлумачыць прыфрантавым становішчам нашага краю, які быў перапоўнены войскамі, паліцыяй і органамі ваеннай контрразведкі. Але наколькі дазвалялі абставіны вялася пэўная грамадска- дабрачынная і культурна-асветніцкая праца. Вайна прынесла вялікія бедствы беларускаму народу. Масава гінула мірнае насельніцтва, руйнаваліся гарады, мястэчкі, вёскі, знішчаліся матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці нашага краю.

У гэтых абставінах ліберальна-дэмакратычны лагер рабіў усё магчымае каб засцерагчы краіну ад пачатку рэвалюцыі, якую лібералы лічылі нацыянальным бедствам. У той жа час будучы ў апазіцыі да ўрада яны імкнуліся з дапамогай палітычных уступак з боку цара і рэформ прыйсці да ўлады. У мэтах аказання ўплыву ў першую чаргу на рабочы клас прадстаўнікі ліберальнай дэмакратыі ў маі 1915 года пачалі стварэнне грамадскіх арганізацый пад назвай ВПК (Ваенна-прамысловыя камітэты). Акрамя гэтага, з дапамогай ВПК разлічвалася ажыццявіць хутчэйшы перавод прамысловасці і транспарта на ваенныя рэйкі, атрымаць ад царскага ўрада выгадныя ваенныя заказы і дамагчыся палітычных уступак. У сярэдзіне 1915 года ВПК разгарнулі сваю дзейнасць у Вільні, Гродне, Беластоку, Мінску, Слоніме, Пінску, Бабруйску, Магілеве, Гомелі, Полацку і Віцебску. 15 ліпеня 1915 года ў Вільні на з'ездзе прадстаўнікоў павятовых камітэтаў быў створаны Паўночна-Заходні абласны ВПК. Яго работа была ў асноўным скіравана на збор і сістэматызацыю звестак пра фабрыкі, заводы, рамесныя, саматужныя прадпрыемствы, ваенныя маўстэрні і абслугоўваючыя іх арганізацыі, што працавалі на патрэбы Заходняга і часткова Паўночнага франтоў. Пераважную большасць членаў ВПК складалі прамыслоўцы, прадстаўнікі тэхнічнай інтэлігенцыі і банкаўскія дзеячы. Але ўсерасійскі з'езд ВПК, які адбыўся ў Петраградзе ў канцы ліпеня 1915 года выказаўся за стварэнне пры ВПК і прадстаўніцтва ад рабочых [2, с. 181]. У выніку гэтага рашэння быў дасягнуты



ПолесГУ

кампраміс: кіраўніцтва ВПК спадзявалася з дапамогай рабочага прадстаўніцтва забяспечыць мір ў грамадстве і спыніць стачачны рух, што б прывяло да павышэння прадукцыйнасці працы; а эсэры, бундаўцы, меншавікі падтрымаўшы стварэнне рабочых груп пры ВПК разлічвалі, што гэтыя групы змогуць абараніць пралетарыят ад жорсткай эксплуатацыі і будуць спрыяць росту ўплыву рабочых на іншыя слаі грамадства. Аднак звестак пра выбары рабочых прадстаўнічых груп на Беларусі не выяўлена. Есць меркаванні, што ў прыфрантавой паласе беларускіх губерняў, яны увогуле не праводзіліся [3, с. 616]. К таму ж у сувязі з надыходзячай акупацыяй нямецкімі войскамі заходняй часткі Беларусі (лета-восень 1915г.), будучы занятыя эвакуацыяй заводаў і фабрык з Мінскай, Віцебскай і Магілеўскай губерняў, а таксама ўлічваючы складанае становішча на фронце ВПК не змаглі тут разгарнуць больш-менш істотнай дзейнасці. Паўночна-Заходні ВПК вымушаны быў пераехаць з Вільні ў Петраград, дзе існаваў да сакавіка 1916 года. За гэты тэрмін ён працягваў выконваць даручэнні Цэнтральнага ВПК па размяшчэнню на новых месцах эвакуіраваных з беларускіх губерняў прадпрыемстваў і займаўся афармленнем ваенных заказаў.

Больш паспяхова праводзілася работа арганізацый – земскага і гарадскога саюзаў дапамогі хворым і параненым воінам. З выпадку таго, што ў гады вайны перад саюзамі земстваў і гарадоў стаялі аналагічныя мэты і задачы ў ліпені 1915 года гэтыя саюзы зліліся ў адзіную арганізацыю, якая атрымала назву “Земгор”. Упаўнаважаным па “Земгору” у нашым краі быў выбраны старшыня Мінскай губернскай земскай управы Б.М. Самойленка, галосным прадстаўніком Р.А.Скірмунт і 10 членаў [4, с. 67]. Выяўляючы поўную гатоўнасць узяць на сябе частку абавязкаў, ускладзеных ваеннымі падзеямі на дзяржаву, дзейнасць “Земгора” усё больш набывала ваенную афарбоўку, уцягваючыся ў вадаварот вайны. Органы гарадскога і земскага самакіравання прымаюць актыўны ўдзел у ваенных справах, развіваюць інтэнсіўную дзейнасць па аказанню дапамогі арміі, задавальняючы па магчымасці яе патрэбы адзеннем і харчаваннем, праяўляюць пэўны клопат аб лёсе членаў сем’яў, мабілізаваных на фронт, аказваюць дапамогу параненым салдатам і вядуць мэтанакіраваную апазіцыйную да ўрада прапагандысцкую работу сярод салдацкага асяроддзя і мірнага насельніцтва. Акрамя гэтага “у канцы 1915 г. у час эвакуацыі дзейнасць “Земгора” некалькі мяняе накірунак: вылучаецца на віднае месца дапамога бежанцам, з гэтай мэтай на шляху іхняга праходжання ўсталёўваюцца харчовыя пункты і адчыняюцца часовыя баракі” [5, с. 1]. Але з паведамлення вайсковай газеты “Вестник комитета Западного фронта” бачна, што гэта дапамога насіла толькі часовы характар: “…у сувязі з адступленнем войск значна ўзраслі і ўскладніліся галоўныя, першасныя задачы франтавой земскай арганізацыі, а менавіта задачы па абслугоўванню арміі, з выпадку гэтага Камітэт па прапанове старшыні В.П.Вырубава прызнаў, што франтавая арганізацыя Усерасійскага Земскага Саюза не ў сілах пашырыць далейшую дзейнасць па аказанню дапамогі бежанцам” [6, с. 2].

Тым не менш службовыя асобы земскіх структур сістэматычна выязджалі на месцы і збіралі інфармацыю аб патрэбах насельніцтва, працягвалі кіраваць перамяшчэннямі бежанцаў, займаліся іх працаўладкаваннем, рэгістравалі заявы аб стратах родных, смертных выпадках і г.д. [7, с. 3]. На падставе гэтых дадзеных адпаведнымі земскімі органамі прымаліся рашэнні.

Земствы мелі і адносную самастойнасць, яны самі выбіралі свае выканаўча-распарадчыя органы, фарміравалі структуру кіравання, вызначалі галоўныя напрамкі дзейнасці, камплектавалі штаты спецыялістаў, ведалі фінансамі. Па дадзеных на 1 лістапада 1916 года занятымі на абслугоўванні Заходняга фронта налічвалася крыху болей за дзве тысячы земскіх арганізацый [8, с. 3]. Патрэбна адзначыць, што сама назва дэпутатаў земстваў – “гласныя” сведчыла аб адкрытасці іх дзейнасці перад народам, галоснасці мэтаў іх працы. Дапаўняльнай крыніцай сіл земстваў з’яўляліся спецыялісты з асяроддзя дэмакратычнай інтэлігенцыі (урачы, інжынеры, настаўнікі, адвакаты, аграномы і г.д.), якія безкарысна імкнуліся ў час ваеннага ліхалецця дапамагчы простым людзям выйсці з становішча цемры і галечы.

Важкі ўклад мясцовая органы самакіравання ўнеслі ў працэс наладжвання і аднаўлення выхаваўчых і навучальных устаноў, павышэння ўзроўню медыцыны, развіцця статыстыкі і кааператыўнага руху і інш. Вялікая заслуга належыць земствам і ў справе абуджэння жыццёвай актыўнасці, гаспадарчай ініцыятывы сярод сельскага і гарадскога насельніцтва беларускіх губерняў. Нават ў самых неспрыяльных умовах вайны, работа сканцэнтраваная ў розных галінах забяспечвала жыццядзейнасць земстваў і парой ураждвала эфектыўнасцю працы.

Такім чынам, праяўляючы пэўны клопат аб салдатах, гарадскім і сельскім насельніцтве прадстаўнікі ліберальна-дэмакратычнага лагеру – кадэты, кіраўнікі земстваў, прадпрымальнікі шукалі сабе апору і падтрымку сярод народных мас. Яны дамагаліся ўвядзення у Расійскай імперыі канстытуцыйнай манархіі з парламентам, каб затым праз парламент з дапамогай імі створаных арганізацый, ВПК і Земгора, уздзейнічаць на органы ўлады. І ўсе ж негледзячы на некаторыя поспехі дзейнасці арганізацый ВПК і Земгора на беларускіх землях падчас Першай сусветнай вайны цэнтрысцкі блок істотных дывідэнтаў ад гэтага не атрымаў і адпаведна не меў значнага ўплыву.


1. Высочайший рескрипт, данный на имя Министра Внутренних Дел, гофмейстера Высочайшего Двора Маклакова // Правительственный вестик. – 1914. – 12 июля.
2. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 2. Рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал.рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994, - 537с.
3. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. – Мінск: навука і тэхніка, 1972. – Т.2. – 688с.
4. Слобожанин, В.П. Земское самоуправление в Беларуси (1905-1917гг.)/ В.П. Слобожанин. – Минск: Гавриленко В.Г., 1994. – 85 с.
5. Краткий Отчет о деятельности Минского Губернского Комитета В.З.С. за 1916г. – Минск: Тип. Б.Л.Каплан, 1917. – 32 с.
6. Земский Союз в помощь беженцам // Вестник Комитета Западного фронта. – 1916. – 9 августа.
7. Справочное бюро В.З.С. в Бобрйске // Вестник Комитета Западного фронта. – 1916. – 14 августа.
8. Учреждение Земского Союза на Западном фронте // Вестник Комитета Западного фронта. – 1916. – 31 декабря.


ПолесГУ